УДК 811.161.3’38

# ЭКСТРАЛІНГВІСТЫЧНЫЯ ПАДСТАВЫ ВЫДЗЯЛЕННЯ КАНФЕСІЙНАГА СТЫЛЮ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Савіцкая І. У., канд. філал. навук, дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле вызначаны статус канфесійнага стылю ў сістэме функцыянальных стыляў сучаснай беларускай мовы ў залежнасці ад экстралінгвістычных фактараў.

Ключавыя словы: канфесійны стыль, функцыянальны стыль, рэлігія, рэлігійная свядомасць, рэлігійная дзейнасць.

# THE EXTROLINGUISTIC GROUNDS FOR HIGHLIGHTING THE CONFESSIONAL STYLE IN THE MODERN BELARUSIAN LANGUAGE

**Savitskaya I. V., associate professor**
*Belarusian National Technological University,*
*Minsk, Republic of Belarus*

Summary: the article highlights the status of the confessional style in the system of functional styles of the modern Belarusian language, depending on extrolinguistic factors.

Keywords: confessional style, functional style, religion, religious awareness, religious activity.

Канфесійны стыль дапаўняе традыцыйную сістэму функцыянальных стыляў сучаснай беларускай мовы, поўнасцю адпавядаючы асобым экстралінгвістычным крытэрыям. Рэлігійная свядомасць і адпаведная дзейнасць – галоўныя экстралінгвістычныя падставы для вызначэння функцыянальнага стылю.

Рэлігійная свядомасць з’яўляецца адной з самых старажытных форм светаразумення. Згодна з вучэннем царквы вера з’яўляецца саюзам паміж Богам і чалавекам. Самая высокая годнасць чалавека ў тым, што ен з’яўляецца вобразам і падабенствам Божым. Вера

чалавека становіцца па-сапраўднаму глыбокай, калі слова Божае робіцца яго ўнутраным здабыткам. Інакш кажучы, чалавек, успрымаючы слова Боскага адкрыцця, згаджаецца з ім, прымае яго і ўсведамляе як сваю вышэйшую каштоўнасць. Адсюль вера ўяўляецца як яднанне чалавека з Богам.

Рэлігійная свядомасць грунтуецца на дагматах веры. Гэта такі стан свядомасці, які ўяўляе сабой адсутнасць усялякага сумнення ці вагання аб быцці і існасці Бога; безумоўнае прызнанне ісцін, адкрытых Богам. Гэтыя ісціны не патрабуюць доказу і не спасцігаюцца розумам чалавека, яны прымаюцца як аксіемы. Гэтыя дагматы – важнейшыя прынцыпы рэлігійнага светапогляду. У іх пастаянным сцвярджэнні, падтрыманні і распаўсюджванні складаецца важнейшая мэта канфесійнага стылю.

Рэлігія істотна ўплывае на многія формы грамадскай свядомасці (мастацтва, навуку, права, палітыку), паколькі фарміруе светапоглядныя ўстаноўкі чалавека. Яна вызначае не толькі асаблівасці рэлігійнай дзейнасці, але і асаблівасці функцыянавання асобы і грамадства ў іншых сферах чалавечай дзейнасці. Рэлігійная карціна свету адрозніваецца такім анталагічным прынцыпам, як двухмір’е, што дэтэрмінуе спецыфіку ўласна лінгвістычнага канструктыўнага прынцыпу канфесійнага стылю [1].

Функцыянальны стыль, акрамя формы грамадскай свядомасці, вызначаецца відам чалавечай дзейнасці. У дачыненні да рэлігійнай сферы неабходна гаварыць не пра інтэлектуальную, а пра духоўную дзейнасць чалавека. Інтэлект, розум накіраваны на доказ ісціны, а ў духоўнай сферы фармальная логіка доказу не патрэбна, рэлігійныя ісціны даюцца чалавеку як нешта першапачаткова правільнае і адпаведнае духоўным патрэбам людзей. Духоўная дзейнасць, такім чынам, – гэта галоўны змест жыцця вернікаў.

Хрысціянства, якое абвясціла любоў як вышэйшую благадаць і якое трактуе жыцце як поле барацьбы дабра са злом, праз Боскае адкрыцце атрымала шэраг вышэйшых маральных каштоўнасцей. Хрысціянскі Бог трыадзіны, але бліжэй праваслаўнаму хрысціяніну Бог Сын – увасабленне Духа Святога ў вобразе чалавека. Маральныя законы, прынцыпы мы атрымліваем ад Ісуса Хрыста.

Як было адзначана вышэй, спецыфічнай рысай рэлігійнай свядомасці з’яўляецца імкненне чалавека наблізіцца да Бога, паяднацца з ім. У хрысціянстве такое імкненне тлумачыцца як

выратаванне, пад якім разумеецца максімальна магчымае для кожнага суб'екта набліжэнне да Бога пасля заканчэння зямнога існавання. Ідэя выратавання з'яўляецца глабальнай і сэнсаўтваральнай; менавіта яна фарміруе ўсе астатнія мэты верніка.

Імкненне чалавека да выратавання, яго пастаянны арыенцір на сакральныя каштоўнасці вызначае яго паводзіны ў зямным жыцці. Т.В. Іцковіч адзначае, што «ідэя выратавання» фарміруе трыяду *думка-слова-справа* рэлігійна арыентаванага чалавека ў любой сферы дзейнасці, у прыватнасці, увасобленую ў слове думку, якая прыводзіць да ўчынка [2, с. 42].

Яднаючы жыцце двух светаў – зямнога, прыродна-сацыяльнага, і трансцэндэнтнага, – рэлігія адрозніваецца разнастайнасцю духоўнай дзейнасці; з гэтым звязана і асабістае выратаванне душы.

Такім чынам, рэлігійная свядомасць, якая грунтуецца на ідэі двухмір'я, і рэлігійная дзейнасць, галоўная ідэя якой – выратаванне, з'яўляюцца экстралінгвістычнымі падставамі для выдзялення канструктыўнага прынцыпу канфесійнага стылю сучаснай беларускай мовы – асобую змястава-сэнсавую і ўласна маўленчую арганізацыю тэкстаў, прызначэнне якой – садзеянне яднанню чалавечай душы з Богам [3].

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Гадомский, А. К. Стилистический подход к изучению религиозного языка / А. К. Гадомский // Стил. – Белград, 2008. – С. 21–35.

2. Ицкович, Т. В. Жанровая система религиозного стиля на коммуникативно-прагматическом и категориально-текстовом основаниях: дисс. … д. филол. н. / Т. В. Ицкович. – Екатеринбург, 2016. – 387 с.

3. Прохватилова, О. А. Экстралингвистические параметры и языковые характеристики религиозного стиля / О. А. Прохватилова // Вестник Волгоградского государственного университета. – Серия 2. Языкознание. – 2006. – С. 19–26.